# НАУЧНАЯ ЖИЗНЬ

## XVII МІЖНАРОДНАЯ НАВУКОВАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ «БЕЛАРУСЬ І ГЕРМАНІЯ: ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ» У МДЛУ

6 красавіка 2018 г. у Мінскім дзяржаўным лінгвістычным універсітэце кафедрай гісторыі, сусветнай культуры і турызму і аддзелам ваеннай гісторыі Беларусі Інстытута гісторыі НАН Беларусі праведзена XVII Міжнародная навуковая канферэнцыя «Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць», прысвечаная 70-годдзю ўніверсітэта. У канферэнцыі прынялі ўдзел 35 гісторыкаў, у тым ліку даследчыкі з розных навуковых, вучэбных, архіўных і музейных устаноў Беларусі (Брэст, Мінск, Полацк), Германіі (Ляйпцыг, Мюнхен), Латвіі (Рыга), Польшчы (Гданьск) і Расіі (Арэнбург, Санкт-Пецярбург).

Адкрываючы канферэнцыю, прарэктар па навуковай працы ўніверсітэта сустаршыня оргкамітэта Л. А. Тарасевіч адзначыла, што гэта сустрэча праходзіць у адметны год у жыцці ўстановы адукацыі – 70-годдзе з дня ўтварэння Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута замежных моў. Дзякуючы мэтанакіраванасці кіраўніцтва ўніверсітэта, творчаму пошуку прафесарска-выкладчыцкага складу і актыўнай дзейнасці студэнцкай моладзі працоўнаму калектыву за гэтыя гады ўдавалася паспяхова вырашаць шматлікія задачы па гуманітарнай, прафесійнай і маральнай падрыхтоўцы выпускнікоў Мінскага іняза. Пры вывучэнні праграмы канферэнцыі бачна: юбілейная тэматыка адлюстравана ў адным з дакладаў, які прысвечаны ваеннай біяграфіі мінскіх інязаўцаў. Прыемна нагадаць удзельнікам канферэнцыі, што чарговая канферэнцыя праводзіцца ў рамках выканання Дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў на 2016–2020 гг. «Эканоміка і гуманітарнае развіццё беларускага грамадства» (навуковы кіраўнік – член-карэспандэнт НАН Беларусі, доктар гістарычных навук, прафесар А. А. Каваленя). Кафедра гісторыі, сусветнай культуры і турызму МДЛУ (навуковы кіраўнік – кандыдат гістарычных навук, дацэнт С. Я. Новікаў) забяспечвае выкананне задання «Сацыяльна-эканамічныя і грамадскія змены на акупаванай тэрыторыі ў адлюстраванні дакументальнай калекцыі Генеральнага камісарыяту “Беларусь”. 1941–1944 гг.».

На заканчэнне прарэктар універсітэта выказала ў адрас удзельнікаў канферэнцыі пажаданні творчых поспехаў і спадзяванні на тое, што ў ходзе сустрэчы гісторыкі зробяць важны крок у напрамку далейшага ўзбагачэння гістарычнай навукі новымі знаходкамі, цікавымі не толькі для шырокай навуковай грамадскасці, але і для студэнцтва лінгвістычнай установы адукацыі.

Праца канферэнцыі ладзілася ў фармаце пленарных пасяджэнняў, абагульніўшых навуковыя даклады і паведамленні ў рамках трох праблемных палёў: 1) Людзі – Падзеі – Факты: новыя дакументальныя крыніцы і даследчыцкія падыходы; 2) Вялікая Айчынная вайна: новыя пошукі і знаходкі; 3) Беларусь і Германія ў гістарычнай прасторы: мінулае і сучаснасць.

На пленарных пасяджэннях, якія праходзілі ў Цэнтры беларускай мовы і культуры, вяліся плённыя дыскусіі, адбылася тэматычная размова з удзелам прафесіяналаў і пачынаючых даследчыкаў, якія апантана займаюцца вывучэннем ваеннай гісторыі Беларусі. Кожнае з пленарных пасяджэнняў уяўляла сабой самастойную міні-канферэнцыю, у цэнтры якой знаходзілася актуальная гістарычная праблематыка.

У ходзе першага пасяджэння «Людзі – Падзеі – Факты: новыя дакументальныя крыніцы і даследчыцкія падыходы» былі заслуханы навуковыя даклады айчынных і замежных даследчыкаў, у тым ліку: С. Я. Новікава (Мінск), Ю. З. Кантар (Санкт-Пецярбург), Г. Берэндта (Гданьск), К. Зэліса (Рыга), К. Ганцара (Ляйпцыг), а таксама Ю. фон Зааль (Мюнхен), У. К. Коршука (Мінск), І. А. Карпенка (Санкт-Пецярбург) і Р. Р. Хісамутдзінавай (Арэнбург).

Прадстаўленыя навуковыя матэрыялы і іх абмеркаванне яшчэ раз пераканалі ўдзельнікаў у тым, што па цяперашні час даследчыкі актыўна выяўляюць новыя дакументальныя крыніцы і працуюць з імі, яны адразу ж уключаюцца ў навуковы дыскурс. Напрыклад, С. Я. Новікаў упершыню ўвёў у навуковы зварот малавядомыя архіўныя матэрыялы, прысвечаныя былым выкладчыкам і студэнтам Мінскага іняза, тым, хто ў гады Вялікай Айчыннай вайны на розных франтах ўдзельнічаў у баявых дзеяннях Чырвонай арміі, знаходзіўся ў радах партызанскага супраціву ў Беларусі, вызваляў яе ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, пасля чаго навучаўся або працаваў у інстытуце замежных моў. Ю. З. Кантар звярнулася да раней невядомых фактаў аб вяртанні расійскіх мастацкіх каштоўнасцяў з розных фондаў і калекцый сучаснай Германіі, дзе яшчэ часам знаходзяцца малавядомыя шэдэўры з Эрмітажа і іншых музеяў Расіі, адкуль яны былі вывезены ў гады вайны. Навуковы дырэктар Музея гісторыі Другой сусветнай вайны, нядаўна адкрытага ў Гданьску, прафесар Г. Берэндт спыніўся на польскіх даследаваннях, якія звязаны з гісторыяй Халакосту на тэрыторыі Пінскай вобласці акупаванай Беларусі 1942–1943 гг., аднак на шырокай базе розных крыніц актыўна распрацоўваецца ў Польшчы ў апошнія гады. Аб узроўні і асаблівасцях навуковай інтэрпрэтацыі гістарычных фактаў у найноўшых гістарыяграфічных выданнях у Латвіі ўдзельнікам канферэнцыі распавёў К. Зеліс. Савецкае развіццё наратыву аб «гераічнай абароне» Брэсцкай крэпасці ў другой палове 1940–х і пачатку 1950-х гадоў пераканаўча прааналізаваў К. Ганцар.

Сярод паведамленняў першага пасяджэння выклікалі асаблівы інтарэс наступныя тэмы дакладаў: навуковага супрацоўніка Інстытута найноўшай гісторыі ў Мюнхене доктара Ю. фон Зааль «Дзіцячыя вёскі» (1944) у памяці Беларусі і ў германскіх крыніцах», Заслужанага работніка адукацыі Рэспублікі Беларусь, прафесара У. К. Коршука «Да пытання аб уплыве нацысцкай ідэалогіі на нямецкае грамадства 1930–1940-х гадоў» (БДУ), вучонага сакратара Дзяржаўнага музея гісторыі Санкт-Пецярбургу кандыдата гістарычных навук І. А. Карпенка «Дзённік Тані Савічавай. Гісторыя і міфы», прафесара Арэнбургскага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта Р. Р. Хісамутдзінавай «Франтавыя будні ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны ў крыніцах асабістага паходжання».

На другім пленарным пасяджэнні прагучалі даклады У. В. Здановіча (Брэст), Э. Р. Іофе (Мінск), М. В. Стральца (Брэст), А. В. Шаркова (Мінск).

Прафесар БДУ імя А. С. Пушкіна У. В. Здановіч звярнуўся да аналізу сучаснага вывучэння гісторыі Беларусі часоў Вялікай Айчыннай вайны, акцэнтуючы ўвагу аўдыторыі на агульных тэндэнцыях і адметных навуковых падыходах у даследаванні асобных пытанняў ваеннай гісторыі Беларусі 1941–1945 гг. Прафесар БДПУ імя М. Танка Э. Р. Іофе на аснове выкарыстання гістарыяграфічных фактаў паказвае тое, як ўдзельнічалі яўрэі СССР у Сталінградскай бітве. Прафесар БрДТУ М. В. Стралец прадставіў вынікі даследавання ваеннага лёсу вядомага савецкага военачальніка Л. А. Говарава, які камандаваў аперацыяй па ажыццяўленні войскамі Чырвонай арміі прарыву блакады Ленінграда ў студзені 1943 г. Прафесар Акадэміі Міністэрства ўнутраных спраў А. В. Шаркоў паведаміў пра малавядомыя старонкі гісторыі палону румынскіх салдат і афіцэраў, якія былі захоплены ў палон на беларускай зямлі ў ходзе адступлення вермахта і потым адбывалі пакаранні ў БССР да канца 1940-х гадоў.

У паведамленнях, заслуханых на другім пленарным пасяджэнні, звярталася ўвага на новыя дакументальныя знаходкі, гістарыяграфічныя факты і даследчыцкія ацэнкі, ў тым ліку па малавядомых старонках гісторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. У ходзе пасяджэння прагучалі паведамленні, якія закраналі наступную тэматыку: «Вайна і дзеці: выхаванцы Іванаўскага інтэрнацыянальнага дзіцячага дома на акупаванай тэрыторыі Беларусі (1941–1944)» (І. Ю. Варанкова), «Трафейныя дакументы як крыніца па вывучэнні лакальнай гісторыі перыяду нацысцкай акупацыі Беларусі» (Я. А. Грэбень), «Культура памяці Трасцянца» (А. Я. Далгоўскі), «Партызанская авіяцыя» (Д. І. Кіенка), «Узбуйненне брацкіх могілак і праблема ўвекавечання імёнаў загінуўшых салдат Чырвонай арміі (на прыкладзе Камойскага сельсавета Пастаўскага раёна)» (А. І. Корсак), «Узаемадзеянне партызан Беларусі і Літвы ў гады Вялікай Айчыннай вайны (1941–1944)» (А. А. Крыварот), «Месца масавых расстрэлаў і пахаванняў на тэрыторыі БССР (1940–1941)» (І. М. Кузняцоў), «Дзейнасць нямецкіх разведвальна-дыверсійных школ і курсаў на тэрыторыі СССР у гады ў гады Вялікай Айчыннай вайны: колькасныя і рэгіянальныя характарыстыкі» (С. В. Кулінок), «Савецкі Саюз і германскае пытанне у перыяд карэннага пералому ў Вялікай Айчыннай вайне» (І. А. Літвіноўскі, Ю. І. Літвіноўская), «Ворагі дзвюх дыктатур. Тулеган Целешаў – дзве гісторыі аднаго партызана» (Д. Панцьё), «Фінансавыя аспекты выкарыстання мясцовай працоўнай сілы ва ўстановах і на прадпрыемствах Беларусі ў перыяд акупацыі (1941–1944) паводле калекцыі дакументаў Генеральнай акругі Беларусь» (А. Г. Цымбал), «Школьная адукацыя на акупаванай тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны» (Г. С. Хадасевіч).

У час правядзення трэцяга пленарнага пасяджэння былі заслуханы даклады і паведамленні, у якіх аўтары звярталіся да такога важнага аспекта гісторыі, як беларуска-нямецкія узаемадачыненні ў гістарычнай і культурнай

прасторах. Доктар мастацтвазнаўства, прафесар кафедры гісторыі, сусветнай культуры і турызму А. М. Кушнярэвіч адкрываў пасяджэнне дакладам на тэму «Гродзенскія замкі ў творчым лёсе нямецкіх архітэктараў». Аб нямецкай школьнай справе на тэрыторыі Беларусі ў гады Першай сусветнай вайны паведамілі дацэнт Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь В. П. Дзмітрыева і дацэнт БДПУ імя М. Танка У. У. Куніцкі. Дацэнт БДУ В. В. Брыгадзіна звярнула ўвагу аўдыторыі на наступствы ідэалагічных кампаній па барацьбе з іншадумствам, «касмапалітамі і іншымі антысавецкімі элементамі» ў СССР цягам пасляваенных гадоў.

Даследчыкі Л. А. Осіпава, І. А. Саракавік, М. М. Смальянінаў, А. Г. Трубчык, А. Г. Цымбал і М. Б. Шчаўлінскі прадставілі тэмы, прысвечаныя, адпаведна: удзелу моладзі ў аднаўленні Мінска ў пасляваенны перыяд, супрацоўніцтву вышэйшых школ Беларусі і ГДР у 1970–1980-я гады, выхаду Расіі з Першай сусветнай вайны і пачатку замежнай інтэрвенцыі, беларускай школе ва ўмовах ваенна-палітычных канфліктаў (1914–1921), нацыянальнай структуры насельніцтва Заходняй Беларусі (1921–1939), трагічным старонкам Нарачанскай наступальнай аперацыі рускіх войскаў у сакавіку 1916 г.

Завяршылася канферэнцыя прэзентацыяй трох новых навуковых выданняў. Першым з іх стала калектыўныя праца беларускіх і расійскіх даследчыкаў у рамках праекта «Страна в огне», якія выкананы ў трох тамах і шасці кнігах. Быў прадстаўлены другі том – «Коренной перелом. 1942–1943 : в 2 кн. Кн. 1. Очерки» і «Коренной перелом. 1942–1943 : в 2 кн. Кн. 2. Документы и материалы». Іх прадставіў адзін з сааўтараў – загадчык кафедры гісторыі, сусветнай культуры і турызму МДЛУ С. Я. Новікаў. Падчас прэзентацыі было адзначана, што з беларускага боку выканаўцамі праекта з'яўляліся вядучыя навукоўцы Інстытута гісторыі НАН Беларусі, у тым ліку член-карэспандэнт НАН Беларусі, акадэмік-сакратар Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў А. А. Каваленя, дырэктар Інстытута гісторыі В. В. Даніловіч, загадчык аддзела ваеннай гісторыі Беларусі А. М. Літвін, вядучы навуковы супрацоўнік аддзела А. А. Крыварот і старшыя навуковыя супрацоўнікі аддзела Я. П. Бязлепкін, І. Ю. Варанкова, А. У. Кузняцова-Ціманава. Другое выданне – «Коттбус». Нацистская карательная операция в Беларуси, май–июнь 1943 г.: документы и материалы» прадставіў загадчык аддзела інфармацыі і навуковага выкарыстання дакументаў Беларускага дзяржаўнага архіва навукова-тэхнічнай дакументацыі кандыдат гістарычных навук С. В. Кулінок. Трэцяе выданне – «Павлов В. П. Дети лихолетья: документальные очерки и повести» – прэзентавалі выкладчыкі БДУ – прафесар І. Ф. Раманоўскі і дацэнт А. І. Котаў.

У заключэнні былі падведзены вынікі канферэнцыі, удзельнікі якой адзначылі, што міжнароднае навуковае супрацоўніцтва з'яўляецца адметнай прыкметай сустрэч у МДЛУ. Добрай традыцыяй стала таксама рэгулярнае выданне матэрыялаў міжнароднай навуковай канферэнцыі «Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць».

*Сяргей Новікаў,*
сустаршыня аргкамітэта канферэнцыі
кандыдат гістарычных навук